СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 24 красавіка 1997 года, чацвер, № 7(1762)

Беларускі дзяржаўны універсітэт праводзіць 15 мая 1997 года "Дзень адчыненых дзвярэй" для абітурыентаў.

Мерапрыемства пачнецца ў 15 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса БДУ (праспект Ф.Скарыны, 4, 4-ты паверх). У праграме: сустрэча з кіраўніцтвам універсітэта і дэканамі факультэтаў, азнаямленне з правіламі прыёму ў БДУ на 1997 год, наведванне вучэбных аўдыторый і лабараторый.

ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ БДУ-97

Старшыня прыёмнай камісіі — рэктар Белдзяржуніверсітэта, КАЗУЛІН Аляксандр Уладзіслававіч

Намеснік старшыні — першы прарэктар,прафесар БРЫГАДЗІН Пётр Іванавіч

Адказны сакратар прыёмнай камісіі — начальнік вучэбна-метад. управаўлення, дацэнт САМАХВАЛ Віктар Васільевіч

Адрас для пісьмовай карэспандэнцыі: 220050 г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, прыёмная камісія (указаць спецыяльнасць).

Сакратарыят прыёмнай камісіі размяшчаецца ў геаграфічным корпусе БДУ (вул. Ленінградская, 16, пакой 110, тэл.226-59-51).

Прыём дакументаў праводзіцца ў геаграфічным корпусе БДУ (1-ы паверх):

аўдыторыя № 101 — юрыдычны факультэт, філалагічны факультэт;

аўдыторыя № 112 — механіка-матэматычны факультэт, фізічны факультэт, хімічны факультэт, факультэт журналістыкі;

аўдыторыя № 113 — факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, гістарычны факультэт, факультэт міжнародных адносін, філасофска-эканамічны факультэт;

аўдыторыя № 114 — біялагічны факультэт, геаграфічны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі.

Прыём апеляцый па пытаннях экзаменацыйных адзнак праводзіцца ў аўдыторыі 109. Апеляцыі прымаюцца толькі ў дзень правядзення вуснага экзамена ці ў дзень абвяшчэння адзнак па пісьмоваму экзамену.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

Ў БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ НА 1997 ГОД

1. Для атрымання бясплатнай першай вышэйшай адукацыі ў Белдзяржуніверсітэт прымаюцца на конкурснай аснове асобы з сярэдняй адукацыяй, якія:

а) пастаянна пражываюць у рэспубліцы;

б) грамадзяне Беларусі і беларусы; якія пражываюць за яе межамі;

в) грамадзяне Расійскай Федэрацыі.

Грамадзяне іншых замежных дзяржаў прымаюцца ў Белдзяржуніверсітэт на платнай падставе па выніках субяседавання, калі іншае не прадугледжана міждзяржаўнымі пагадненнямі.

2. На платнае навучанне па ўсіх спецыяльнасцях звыш кантрольных лічбаў прыёму, фінансуемых за кошт бюджэтных сродкаў, прымаюцца асобы, якія:

а) станоўча вытрымалі ўсе ўступныя выпрабаванні, але не прайшлі па конкурсу на бюджэтныя месцы;

б) выказалі жаданне паступаць у Белдзяржуніверсітэт па субяседаванню з правам атрымання на працягу першага года навучання індывідуальных кансультацый без дадатковай аплаты.

Памер аплаты залежыць ад спецыяльнасці, формы навучання, падставы для залічэння. Кошт платнага навучання не перавышае фактычных затрат на падрыхтоўку спецыяліста і зацвярджаецца па кожнай спецыяльнасці адпаведным загадам рэктара БДУ.

3. Паступаючыя ў Белдзяржуніверсітэт падаюць у прыёмную камісію ці дасылаюць па пошце наступныя дакументы: заяву на імя рэктара па адзінай форме; дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале; 6 фотакартак памерам 3х4; медыцынскую даведку па форме 086У (выдадзеную не раней 15 мая 1997 года). Паступаючыя на завочнае навучанне, акрамя таго, прадстаўляюць выпіску (копію) з працоўнай кніжкі, а асобы, якія знаходзяцца на ўліку ў службе занятасці насельніцтва, — дакумент, які аб гэтым сведчыць.

Пашпарт прад'яўляецца абітурыентам асабіста.

4. Дакументы ад паступаючых на дзённую і завочную формы навучання прымаюцца з 26 чэрвеня па 15 ліпеня. Уступныя выпрабаванні праводзяцца з 16 ліпеня. Залічэнне ў склад студэнтаў: на бюджэтнае навучанне — да 1 жніўня, на платнае навучанне — да 25 жніўня.

Пералік уступных экзаменаў па кожнай спецыяльнасці даецца ў дадатку 1.

Дакументы ад асоб, якія выказалі жаданне паступаць на платнае навучанне па выніках субяседавання, прымаюцца з 26 чэрвеня па 20 жніўня. Тэрміны правядзення субяседавання з гэтымі асобамі вызначаюцца прыёмнай камісіяй.

Пералік дысцыплін, па якіх праводзіцца субяседаванне, даецца ў дадатку 2.

5. Уступныя выпрабаванні праводзяцца па праграмах, якія складзены ў адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Паступаючыя маюць права здаваць уступныя выпрабаванні па выбары на беларускай ці на рускай мове.

Уступны экзамен па замежнай (англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай) мове абітурыенты могуць здаваць па выбары, незалежна ад таго, па якой замежнай мове яны былі атэставаны. Выключэннем з'яўляецца спецыяльнасць сучасныя замежныя мовы, пры паступленні на якую абітурыенты здаюць уступны экзамен па замежнай мове ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю.

Выпускнікам школ, якія пастаянна пражываюць у зонах радыяцыйнага забруджвання, паступаючым на спецыяльнасці гісторыя, музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры, гісторыка-архівазнаўства, філасофія, сацыялогія, псіхалогія, інфармацыя і камунікацыя (філасофска-эканамічны факультэт), эканамічная тэорыя, менеджмент (філасофска-эканамічны факультэт), прадастаўляецца права замест уступнага экзамена па замежнай мове здаваць уступны экзамен па беларускай мове і літаратуры (калі адзін з экзаменаў яны здаюць па рускай мове і літаратуры) ці па рускай мове і літаратуры (калі адзін з экзаменаў яны здаюць па беларускай мове і літаратуры).

6. Абітурыенты, якія не з'явіліся на выпрабаванне без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца.

7. Залічэнне ва універсітэт на бюджэтныя месцы праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных выпрабаваннях.

На платнае навучанне ў першачарговым парадку залічваюцца асобы, якія вытрымалі ўсе ўступныя выпрабаванні, але не прайшлі па конкурсу.

8. Асобы, якія скончылі сярэднюю навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або ПТВ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай,

пры паступленні на спецыяльнасці:

матэматыка, механіка, прыкладная матэматыка, інфарматыка, эканамічная кібернетыка, актуарная матэматыка, фізіка, радыёфізіка, фізічная электроніка, камерцыйная дзейнасць, хімія, хімія лекавых злучэнняў, экалогія (хімічны факультэт), біялогія, біятэхналогія, экалогія (біялагічны факультэт) залічваюцца па выніках тэсціравання па дысцыпліне, якая прыведзена ў пераліку ўступных экзаменаў першай. Дакументы ад іх прымаюцца да 12 ліпеня ўключна, тэсціраванне — 14 ліпеня. Асобы, не залічаныя па выніках тэсціравання, здаюць адзін экзамен, які прыведзены ў пераліку першым. Пры атрыманні адзнакі "пяць" яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены;

(Заканчэнне на стар.2)

Запрашае Беларускі дзяржаўны універсітэт

Аляксандр Уладзіслававіч КАЗУЛІН, старшыня прыёмнай камісіі, рэктар Белдзяржуніверсітэта:

— Дарагія абітурыенты!

Сёлета Беларускі дзяржаўны універсітэт ажыццяўляе прыём студэнтаў на 13 факультэтаў, якія рыхтуюць спецыялістаў па 34 спецыяльнасцях. Найбольш падрыхтаваныя з вас паспяхова вытрымаюць конкурсныя экзамены і стануць студэнтамі нашага універсітэта. Вы будзеце членамі вялікай і дружнай студэнцкай сям'і, якая налічвае зараз звыш 14 тысяч чалавек. Побач з беларускімі студэнтамі ў БДУ навучаецца каля 200 грамадзян больш чым з 30 краін Афрыкі, Азіі, Амерыкі і Еўропы.

Кожны з вас хутка будзе выбіраць спецыяльнасць навучання і тут вельмі важна не памыліцца. Трэба ўлічваць не столькі сённяшні прэстыж той ці іншай прафесіі, колькі вашыя ўласныя схільнасці і інтарэсы. Ва ўніверсітэце створаны ўсе ўмовы для атрымання адукацыі самага высокага ўзроўню па ўсіх спецыяльнасцях. А першакласныя спецыялісты будуць заўсёды запатрабаваны грамадствам і карыстацца вялікай павагай.

У апошнія гады ва універсітэце ўведзены новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі: міжнародныя адносіны, міжнароднае права, псіхалогія, інфармацыя і камунікацыя, актуарная матэматыка, геалогія і разведка карысных выкапняў, экалогія, камерцыйная дзейнасць і іншыя. Упершыню ў гэтым годзе адбудзецца прыём на спецыяльнасць "менеджмент". Значныя змены адбыліся і па тых спецыяльнасцях, якія былі ўведзены раней. Перапрацаваны змест дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага накірунку, узмацнілася падрыхтоўка па інфарматыцы і замежных мовах. А тыя студэнты, якія навучаюцца на спецыяльнасцях, звязаных з міжнароднай дзейнасцю, авалодваюць на добрым узроўні дзвюма замежнымі мовамі. Студэнтам старэйшых курсаў даецца шырокі выбар спецыялізацый навучання. Сярод звыш 140 спецыялізацый найбольш папулярныя тыя, што ўведзены ў апошні час: біятэхналогія, хімія лекавых злучэнняў, менеджмент у сферы міжнароднага турызму і іншыя. Акрамя таго, той, хто навучаецца на дзённай форме, можа паралельна завочна навучацца па другой спецыяльнасці на платнай аснове і, такім чынам, атрымаць два універсітэцкія дыпломы.

Да таго ж, заняткі са студэнтамі вядуць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, сярод якіх 190 дактароў навук, звыш 800 кандыдатаў навук. Свой багаты навуковы і педагагічны вопыт перадаюць моладзі акадэмікі Акадэміі навук Беларусі Я.М.Бабосаў, І.В.Гайшун, В.М.Гурын, М.А.Ізобаў, Ф.М.Капуцкі, А.І.Лесніковіч, А.Р.Мартыненка, В.В.Свірыдаў, А.Ф.Чарняўскі і іншыя.

Студэнты маюць вялікія магчымасці для актыўнага ўдзелу ў навукова-даследчай працы. Пры БДУ працуюць Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, тры буйныя навукова-даследчыя інстытуты, навукова-інжынерны цэнтр, шэраг навукова-даследчых лабараторый і доследных станцый. Многія студэнты з'яўляюцца аўтарамі навуковых артыкулаў і вынаходніцтваў. Пасля заканчэння вучобы такія студэнты, як правіла, паступаюць у аспірантуру, дзе сёння вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па 83 спецыяльнасцях.

Як вы ведаеце, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту нададзены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі. Гэты статус дазваляе больш сістэмна і мэтанакіравана ўдасканальваць падрыхтоўку кадраў, укараняць у вучэбны працэс найбольш сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, абнаўляць вучэбныя планы і праграмы. Дарэчы, статусам прадугледжана і больш высокае матэрыяльнае забеспячэнне студэнтаў Белдзяржуніверсітэта.

Высокі ўзровень выкладання і навуковай працы ў БДУ атрымаў сусветнае прызнанне. Гэта дало магчымасць заключыць пагадненні аб сумеснай дзейнасці з 34 універсітэтамі Еўропы, Амерыкі, Азіі. Штогод шэраг лепшых студэнтаў накіроўваецца ў замежныя вышэйшыя навучальныя ўстановы для працягу навучання.

Ва універсітэце створаны добрыя ўмовы для працы і адпачынку. Мы маем 9 добраўпарадкаваных інтэрнатаў, да паслуг — паліклініка і санаторый-прафілакторый. Пасля вучэбнага дня студэнтаў чакаюць басейн, стадыён, спартыўныя залы, дзесяткі спартыўных секцый, кваліфікаваныя трэнеры.

Гонарам універсітэта з'яўляюцца мастацкія творчыя калектывы — ансамбль танца "Крыжачок", фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш", акадэмічны хор студэнтаў, аркестр народных інструментаў, студэнцкі тэатр, тэатр эстрады, хор народнай песні. Гэтыя калектывы прадстаўлялі мастацтва студэнтаў практычна ва ўсіх кутках зямнога шара. Вялікай папулярнасцю карыстаецца ў студэнтаў і выкладчыкаў каманда КВЗ — знаёмая ўсім па шматлікіх тэлевізійных праграмах.

Дарагія сябры! Мы чакаем вас і жадаем поспехаў на ўступных экзаменах!

Пётр Іванавіч БРЫГАДЗІН, намеснік старшыні прыёмнай камісіі:

— Штогод мы з хваляваннем чакаем свайго абітурыента. Вучоба ва універсітэце патрабуе напружанай практыкі. Але і не толькі. Яна патрабуе і пэўных здольнасцей, таму мы зацікаўлены, каб на першы курс былі залічаны найбольш таленавітыя і працаздольныя маладыя людзі. Дзеля гэтага мы праводзім алімпіяды "Абітурыент БДУ", сустрэчы з выпускнікамі школ, дні адчыненых дзвярэй. Безумоўна, правільны выбар факультэта і спецыяльнасці дазваляе пазбегнуць многіх памылак на шляху навучання. Сёлета ў парадку эксперыменту залічэнне павінна быць праведзена крыху раней, чым у іншых ВНУ. Гэта дае магчымасць абітурыенту падаць даведку аб атрыманых у БДУ адзнаках у іншыя навучальныя ўстановы і ўдзельнічаць у конкурсе на тыя спецыяльнасці, на якія дысцыпліны ўступных экзаменаў супадаюць.

У заключэнне хачу дадаць, што ва універсітэце па любой спецыяльнасці можна атрымаць адукацыю еўрапейскага ўзроўню.

Віктар Васільевіч САМАХВАЛ, адказны сакратар прыёмнай камісіі:

— Першымі ва універсітэце абітурыента сустракаюць члены сакратарыята прыёмнай камісіі. Ад яго работы ў значнай меры залежыць першапачатковае ўражанне ад нашай навучальнай установы. Работнікі сакратарыята могуць даць кваліфікаваныя парады тым, хто яшчэ канчаткова не вызначыўся ў выбары факультэта і спецыяльнасці. У матэрыялах, якія змешчаны ў сённяшнім нумары газеты "Беларускі універсітэт" можна атрымаць таксама вельмі карысныя звесткі аб універсітэце. Больш падрабязная інфармацыя будзе ўтрымлівацца ў "Даведніку для паступаючых у БДУ ў 1997 годзе", які ў хуткім часе будзе выдадзен.

Наша галоўная мэта заключаецца ў тым, каб на ўсіх этапах працы прыёмнай камісіі абітурыенты адчувалі сябе ўтульна і ўпэўнена.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

Ў БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ НА 1997 ГОД

(Заканчэнне. Пачатак на стар.2)

пры паступленні на спецыяльнасці:

геаграфія, геалогія і разведка карысных выкапняў, экалогія (геаграфічны факультэт), гісторыя, музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры, гісторыка-архіваznаўства, беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, сацыялогія, філасофія, інфармацыя і камунікацыя (філасофска-эканамічны факультэт), журналістыка, інфармацыя і камунікацыя (факультэт журналістыкі) здаюць адзін экзамен, які прыведзены ў пераліку першым. Пры атрыманні адзнакі "пяць" яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены;

пры паступленні на спецыяльнасць

славянскія мовы і літаратуры здаюць адзін экзамен (па выбары па адной з дзвюх дысцыплін, якія прыведзены ў пераліку ўступных экзаменаў першымі). Пры атрыманні адзнакі "пяць" яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены;

пры паступленні на спецыяльнасць

сучасныя замежныя мовы здаюць два экзамены, якія прыведзены ў пераліку першымі. Пры атрыманні адзнакі "пяць" яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены;

пры паступленні на спецыяльнасці:

міжнародныя адносіны, сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны, міжнароднае права, менеджмент (факультэт міжнародных адносін), эканамічная тэорыя, менеджмент (філасофска-эканамічны факультэт), псіхалогія, правазнаўства, паліталогія здаюць усе экзамены.

9. Выпускнікі ліцэя БДУ 1997 года, якія маюць у атэстаце толькі добрыя і выдатныя адзнакі, пры паступленні на спецыяльнасці, адпавядаючыя профілю іх падрыхтоўкі, прымаюцца на ўмовах, прадугледжаных дадзенымі Правіламі прыёму для асоб, якія скончылі сярэднюю школу з залатым (сярэбраным) медалем.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення Белдзяржуніверсітэта залічваюцца па-за конкурсам пры ўмове атрымання на ўступных экзаменах адзнак не ніжэй, чым "чатыры".

Пераможцы алімпіяд "Абітурыент БДУ", праведзеных факультэтамі БДУ у 1997 годзе, залічваюцца на гэтыя факультэты без уступных выпрабаванняў. Колькасць пераможцаў вызначаецца рашэннем прыёмнай камісіі. Заключныя туры такіх алімпіяд праводзяцца з удзелам адпаведных прадметных экзаменацыйных камісій.

10. Пераможцы (1, 2, 3 месца) міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд выпускнікоў сярэдніх і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, праведзеных Міністэрствам адукацыі ў 1996-97 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, залічваюцца без уступных выпрабаванняў пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці. Пры паступленні на іншыя спецыяльнасці, такія асобы вызваляюцца ад уступнага выпрабавання па гэтаму прадмету з выстаўленнем адзнакі "пяць".

Пераможцы (1, 2, 3 месца) абласных і Мінскага гарадскога тураў алімпіяд выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў, праведзеных органамі кіравання адукацыяй у 1996-97 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, вызваляюцца ад уступнага выпрабавання па гэтаму прадмету з выстаўленнем адзнакі "пяць" пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці.

Пералік агульнаадукацыйных прадметаў і адпаведных ім спецыяльнасцей даецца ў дадатку 3.

11. Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца:

а) воіны-інтэрнацыяналісты;

б) круглыя сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў;

в) дзеці з сем'яў загінуўшых (памершых) ці стаўшых інвалідамі ў час праходжання вайсковай службы або працы ў складзе савецкіх войскаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памершых) у мірны час пры праходжанні вайсковай службы;

г) інваліды 1 і 2 груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў БДУ і якія могуць наведваць заняткі;

д) асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС".

12. Пры іншых роўных умовах пераважнае права на залічэнне маюць інваліды 3 групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў і асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС".

13. У межах кантрольных лічбаў прыёму БДУ ажыццяўляе мэтавы кантрактны прыём па некаторых спецыяльнасцях. План і ўмовы мэтавага кантрактнага прыёму рэгулююцца адпаведнымі нарматыўнымі дакументамі Міністэрства адукацыі.

14. Пры паступленні на завочную форму навучання асобы, якія скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы па роднасных спецыяльнасцях з дыпломам з адзнакай і працуюць па атрыманай спецыяльнасці не менш за 6 месяцаў, залічваюцца па выніках тэсціравання па дысцыпліне, якая прыведзена ў пераліку ўступных экзаменаў першай, пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці. (Абітурыенты, якія паступаюць на спецыяльнасць правазнаўства, праходзяць тэсціраванне па асновах права). Для выпускнікоў ССНУ 1997 года працоўны стаж не патрабуецца. Дакументы ад такіх асоб прымаюцца да 12 ліпеня ўключна, тэсціраванне — 14 ліпеня. Не залічаныя па выніках тэсціравання паступаюць на падставах, прадугледжаных дадзенымі Правіламі прыёму.

На завочнае навучанне ў першую чаргу залічваюцца:

а) інваліды, якім не супрацьпаказана навучанне ў БДУ;

б) ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас на працягу трох апошніх гадоў;

в) жанчыны, у якіх ёсць дзеці ва ўзросце да трох гадоў;

г) асобы, якія маюць сярэднюю спецыяльную ці прафесійна-тэхнічную адукацыю або стаж практычнай работы не менш за 6 месяцаў і паступаюць на адпаведныя ці роднасныя спецыяльнасці.

На астатнія месцы прымаюцца іншыя асобы.

15. Атрыманне другой вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца на ўмовах поўнай аплаты за навучанне. Парадак залічэння такіх асоб вызначаецца адпаведным Палажэннем Міністэрства адукацыі.

16. Усе іншыя пытанні, звязаныя з прыёмам у БДУ, якія не адлюстраваны ў дадзеных Правілах, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй.

Дадатак 1

ПЕРАЛІК УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ

МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Матэматыка. 2. Механіка:* 1. Матэматыка (вусна). 2. Матэматыка (пісьмова). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ. *1. Прыкладная матэматыка:* 1. Матэматыка (вусна). 2. Матэматыка (пісьмова). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). 4. Замежная мова (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы аднаго дадатковага бала). *2. Інфарматыка. 3. Эканамічная кібернетыка. 4. Актуарная матэматыка:* 1. Матэматыка (вусна). 2. Матэматыка (пісьмова). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Фізіка:* 1. Фізіка (вусна). 2. Матэматыка (пісьмова). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ. *1. Радыёфізіка. 2. Фізічная электроніка. 3. Камерцыйная дзейнасць (на рынку радыёэлектронных сродкаў і інфармацыйных паслуг):* 1. Фізіка (вусна). 2. Матэматыка (пісьмова). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Хімія. 2. Экалогія. 3. Хімія лекавых злучэнняў:* 1. Хімія (вусна). 2. Матэматыка (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Біялогія. 2. Экалогія. 3. Біятэхналогія:* 1. Біялогія (вусна). 2. Хімія (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Геаграфія. 2. Геалогія і разведка карысных выкапняў:* 3. *Экалогія.* 1. Геаграфія (вусна). 2. Матэматыка (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Беларуская мова і літаратура:* 1. Беларуская мова і літаратура (вусна). 2. Беларуская мова і літаратура (сачыненне). 3. Беларуская мова і літаратура (вусна). *2. Руская мова і літаратура:* 1. Руская мова і літаратура (вусна). 2. Руская мова і літаратура (сачыненне). 3. Беларуская мова і літаратура (вусна). *3. Славянскія (польская, сербская і харвацкая) мовы і літаратуры:* 1. Беларуская мова і літаратура (вусна). 2. Руская мова і літаратура (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). 4. Замежная мова (вусна). *4. Сучасныя замежныя (англійская, французская, нямецкая, італьянская) мовы:* 1. Замежная мова (вусна, з аўдыраваннем). 2. Замежная мова (лексіка-граматычны тэст). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна). 4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ФІЛАСОФСКА-ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Філасофія. 2. Сацыялогія. 3. Псіхалогія. 4. Інфармацыя і камунікацыя:* 1. Чалавек і грамадства (вусна). 2. Замежная мова (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). *5. Эканамічная тэорыя. 6. Менеджмент:* 1. Матэматыка (пісьмова). 2. Замежная мова (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Правазнаўства:* 1. Матэматыка (пісьмова). 2. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). 3. Замежная мова (вусна). 4. Чалавек і грамадства (вусна). *2. Паліталогія:* 1. Чалавек і грамадства (вусна). 2. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). 3. Замежная мова (вусна).

ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ. *1. Журналістыка. 2. Інфармацыя і камунікацыя:* 1. Творчае сачыненне (пісьмова, на беларускай або рускай мове, з дзвюма адзнакамі — за змест і за пісьменнасць). 2. Замежная мова (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна).

ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. *1. Гісторыя. 2. Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры. 3. Гісторыка-архівазнаўства:* 1. Гісторыя Беларусі (вусна). 2. Сусветная гісторыя навейшага часу (пісьмова, на беларускай або рускай мове, з дзвюма адзнакамі — за змест і за пісьменнасць). 3. Замежная мова (вусна).

ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН. *1. Міжнародныя адносіны. 2. Міжнароднае права:* 1. Сусветная гісторыя навейшага часу (вусна). 2. Геаграфія (вусна). 3. Замежная мова (вусна, з лексіка-граматычным тэстам і аўдыраваннем). 4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). *3. Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны. 4. Менеджмент:* 1. Матэматыка (пісьмова). 2. Геаграфія (вусна). 3. Замежная мова (вусна, з лексіка-граматычным тэстам і аўдыраваннем). 4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).

ПЕРАЛІК ДЫСЦЫПЛІН, ПА ЯКІХ ПРАВОДЗІЦЦА СУБЯСЕДАВАННЕ

Дадатак 2

1. Матэматыка 2. Механіка 3. Прыкладная матэматыка 4. Інфарматыка 5. Эканамічная кібернетыка 6. Актуарная матэматыка — МАТЭМАТЫКА.

1. Фізіка 2. Радыёфізіка 3. Фізічная электроніка 4. Камерцыйная дзейнасць — ФІЗІКА.

1. Хімія 2. Экалогія (хімічны факультэт) 3. Хімія лекавых злучэнняў — ХІМІЯ.

1. Біялогія 2. Экалогія (біялагічны факультэт) 3. Біятэхналогія — БІЯЛОГІЯ.

1. Геаграфія 2. Геалогія і разведка карысных выкапняў 3. Экалогія (геаграфічны факультэт) — ГЕАГРАФІЯ.

1. Гісторыя 2. Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры 3. Гісторыка-архіваznаўства — ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ.

1. Беларуская мова і літаратура — БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА.

1. Руская мова і літаратура — РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА.

1. Славянскія (польская, сербская і харвацкая) мовы і літаратуры — БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА АБО РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА.

1. Сучасныя замежныя (англійская, французская, нямецкая, італьянская) мовы — ЗАМЕЖНАЯ МОВА.

1. Філасофія 2. Сацыялогія 3. інфармацыя і камунікацыя (філасофска-эканамічны факультэт) — ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА.

1. Эканамічная тэорыя 2. Менеджмент (філасофска-эканамічны факультэт) — МАТЭМАТЫКА.

1. Псіхалогія 2. Правазнаўства 3. Паліталогія — ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА, ЗАМЕЖНАЯ МОВА.

1. Журналістыка 2. Інфармацыя і камунікацыя (факультэт журналістыкі) — ЗАМЕЖНАЯ МОВА, БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА АБО РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА.

1. Міжнародныя адносіны 2.Міжнароднае права — СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ, ЗАМЕЖНАЯ МОВА.

1. Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны 2. Менеджмент (факультэт міжнародных адносін) — МАТЭМАТЫКА, ЗАМЕЖНАЯ МОВА.

Механіка-матэматычны

Механіка-матэматычны факультэт вядзе падрыхтоўку спецыялістаў па дзвюх спецыяльнасцях — механіцы і матэматыцы. Механікі універсітэцкага профілю атрымліваюць глыбокую матэматычную падрыхтоўку, фундаментальную адукацыю ў галіне механікі і неабходныя навыкі ў праграмаванні і выкарыстанні ЭВМ. Пасля заканчэння універсітэта ім прысвойваецца кваліфікацыя "Механік. Матэматык-прыкладнік". З 1987 года на аддзяленні механікі існуюць спецыялізацыі "САПР механічных сістэм", "Механіка робатаў і маніпулятараў", якім у сувязі з павелічэннем у рэспубліцы аўтаматызаваных вытворчасцей удзяляецца значная ўвага.

Падрыхтоўка спецыялістаў-матэматыкаў на факультэце вядзецца на аддзяленнях: навукова-вытворчым, навукова-педагагічным і аддзяленні матэматычнай электронікі. Аддзяленне матэматычнай электронікі адкрылася на факультэце ў 1986 годзе для падрыхтоўкі спецыялістаў, якія будуць працаваць на прадпрыемствах электроннай прамысловасці, а таксама ў іншых галінах народнай гаспадаркі. Падрыхтоўка па гэтай спецыялізацыі вядзецца па індывідуальным вучэбным плане, распрацаваным на факультэце з удзелам вядучых спецыялістаў прадпрыемстваў радыёэлектроннай прамысловасці.

На навукова-вытворчым аддзяленні робіцца акцэнт на навучанне пастаноўцы і рашэнню розных задач. Студэнты навукова-педагагічнага аддзялення вывучаюць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару.

Выпускнікі факультэта — матэматыкі навукова-вытворчага аддзялення працуюць у навукова-даследчых акадэмічных і галіновых інстытутах, канструктарскіх бюро, лабараторыях і вылічальных цэнтрах, на прадпрыемствах прамысловых міністэрстваў і ведамстваў, у банках, вышэйшых навучальных установах. Выпускнікі навукова-педагагічнага аддзялення накіроўваюцца ў вышэйшыя і сярэднеспецыяльныя ўстановы і агульнаадукацыйныя школы. А тыя, каго зацікавіць навукова-даследчая работы, атрымаюць рэкамендацыі ў аспірантуру. Студэнты механіка-матэматычнага факультэта маюць магчымасць на платнай аснове атрымаць дадаткова эканамічную адукацыю, кваліфікацыю рэферэнта перакладчыка (англійская і нямецкая мовы) ці кваліфікацыю "Матэматык. Выкладчык з правам выкладаць на англійскай ці нямецкай мовах".

(праспект Ф.Скарыны, 4, тэл. 220-66-84)

Дэкан — прафесар ЮРЧУК Мікалай Іосіфавіч

Гістарычны

Гістарычны факультэт БДУ з'яўляецца буйнейшым цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў. Год яго афіцыйнага адкрыцця — 1934. За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў больш за 8 тысяч спецыялістаў. Зараз на дзённай і завочнай форме навучання займаецца каля тысячы трохсот студэнтаў.

Выкладчыцкі калектыў факультэта — высокакваліфікаваныя спецыялісты. У 1934 годзе ў штаце факультэта было толькі 14 супрацоўнікаў. У сучасны момант работу на факультэце вядуць 70 штатных супрацоўнікаў, сярод якіх 14 прафесараў і 45 дацэнтаў. Супрацоўнікі факультэта вядуць пленную даследніцкую працу. Значныя вынікі дасягнуты ў падрыхтоўцы дапаможнікаў для ВНУ і школ, метадычных распрацовак на ўсіх гістарычных дысцыплінах, вучэбных праграм.

Падрыхтоўка студэнтаў вядзецца на 2 аддзяленнях па 3 спецыяльнасцях і 9 спецыялізацыях. Старэйшае і буйнейшае з іх — аддзяленне гісторыі, выпускнікі якога атрымліваюць кваліфікацыю "Гісторык, або Гісторык, выкладчык гісторыі". З 1990 года падрыхтоўка гісторыкаў ідзе па дзвюх плынях: беларускамоўнай і рускамоўнай. У 1992 годзе на факультэце распачата падрыхтоўка спецыялістаў па дзвюх новых спецыяльнасцях: гісторыка-архівазнаўства (кваліфікацыя "Гісторык-архівіст"), музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры (кваліфікацыя "Музеязнаўства"). Гэтыя спецыялісты рыхтуюцца на аддзяленні архівазнаўства і музеязнаўства. На ўсіх аддзяленнях навучанне вядзецца па дзённай і завочнай формах.

На гістарычным факультэце працуе 8 кафедраў: гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, гісторыі старажытнага свету і сярэднявечча, гісторыі новага і навейшага часу, расійскай і славянскай гісторыі, новай і навейшай гісторыі славянскіх краін, археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, крыніцазнаўства і музеязнаўства.

Выпускнікі факультэта — гэта спецыялісты з шырокім кругаглядам, высокім агульнаадукацыйным узроўнем. Студэнты атрымліваюць глыбокія спецыяльныя веды, неабходныя для будучай прафесіі. У першую чаргу — па гісторыі Беларусі, гісторыі славянскіх краін, гісторыі краін Заходняй Еўропы, Амерыкі, Азіі і Афрыкі, па археалогіі, этнаграфіі, краязнаўству. Акрамя гэтага выкладаюцца такія дысцыпліны, як філасофія, логіка, псіхалогія, педагогіка, інфарматыка, беларуская мова і літаратура, замежная мова і іншыя.

У новым навучальным годзе студэнтам будзе прапанаваны шэраг сучасных курсаў і спецкурсаў (псіхагісторыя, гісторыя лацінаамерыканскай цывілізацыі, антрапалогія і інш.).

(вуліца Чырвонаармейская, 6, тэл. 227-30-14)

Дэкан — дацэнт ЯНОЎСКІ Алег Антонавіч

Дадатак 3

ПЕРАЛІК АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ І АДПАВЕДНЫХ ІМ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ

МАТЭМАТЫКА: Матэматыка, механіка, прыкладная матэматыка, інфарматыка, эканамічная кібернетыка, актуарная матэматыка;.

ІНФАРМАТЫКА: Інфарматыка;

ФІЗІКА: Фізіка, радыёфізіка, фізічная электроніка, камерцыйная дзейнасць;

АСТРАНОМІЯ: Фізіка, радыёфізіка, фізічная электроніка;

ХІМІЯ: Хімія, хімія лекавых злучэнняў, экалогія (хімічны факультэт);

БІЯЛОГІЯ: Біялогія, біятэхналогія, экалогія (біялагічны факультэт);

ГЕАГРАФІЯ: Геаграфія, геалогія і разведка карысных выкапняў, экалогія (геаграфічны факультэт);

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА: Беларуская мова і літаратура, славянскія мовы і літаратуры;

РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА: Руская мова і літаратура, славянскія мовы і літаратуры;

ГІСТОРЫЯ: Гісторыя, музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры, гісторыка-архіваznаўства;

ЗАМЕЖНАЯ МОВА: Сучасныя замежныя мовы.

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

Загадчыкаў кафедраў: атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, ураўненняў матэматычнай фізікі, батанікі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі;

Прафесараў кафедраў: тэарэтычнай фізікі, радыёфізікі (0,5 стаўкі), агульнай матэматыкі і інфарматыкі (с/с), рускай мовы, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (0,5 стаўкі), міжнародных адносін (0,5 стаўкі), фізічнага выхавання і спорту (с/с), англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

Дацэнтаў кафедраў: агульнай фізікі, фізічнай оптыкі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, тэарэтычнай фізікі, кібернетыкі, фізічнай электронікі, матэматычнага забеспячэння САПР, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, тэорыі функцый, дыферэнцыяльных ураўненняў, функцыянальнага аналізу, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, ураўненняў матэматычнай фізікі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, беларускай літаратуры XX стагоддзя, рускай мовы, гісторыі новага і найноўшага часу, расійскай і славянскай гісторыі са старажытных часоў да пачатку XX стагоддзя, найноўшай гісторыі славянскіх краін, гісторыі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (0,5 стаўкі), грамадзянскага права, тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, сацыялогіі, этыкі і эстэтыкі, міжнародных адносін (с/с), дыпламатычнай і консульскай службы (с/с), педагогікі і праблем развіцця адукацыі, эканамічнай тэорыі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ;

Старшых выкладчыкаў кафедраў: фізічнай оптыкі, сістэмнага аналізу, інфарматыкі, тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, лікавых метадаў і праграмавання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, славістыкі, грамадзянскага права, крыміналістыкі, сацыялогіі, этыкі і эстэтыкі, эканамічных навук, псіхалогіі, рамана-германскіх моў (с/с), англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі;

Выкладчыкаў кафедраў: рыторыкі і методыкі выкладання славянскіх моў і літаратур, замежнай журналістыкі і літаратуры, крыніцазнаўства і музеязнаўства, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (с/с), грамадзянскага працэсу і працоўнага права (с/с), крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, міжнароднага права (0,5 стаўкі), усходніх моў, рамана-германскіх моў (с/с), псіхалогіі, раманскіх моў, фізічнага выхавання і спорту;

Асістэнтаў кафедраў: матэматычнага забеспячэння АСК, матэматычнай фізікі, тэорыі функцый, лікавых метадаў і праграмавання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, мікрабіялогіі, генетыкі і біятэхналогіі, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі (с/с).

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 2-26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" 24 КРАСАВІКА 1997 года.

Біялагічны

Біялагічны факультэт з'яўляецца буйнейшым цэнтрам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у Рэспубліцы Беларусь па спецыяльнасцях "Біялогія" і "Экалогія". Студэнты атрымліваюць кваліфікацыі: "Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі", або "Біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі", або "Эколаг-біёлаг. Выкладчык біялогіі і экалогіі".

На першым і другім курсах студэнты ўсіх кваліфікацый навучаюцца па агульнаму вучэбнаму плану, які прадугледжвае вывучэнне асноўных агульнаадукацыйных, сацыяльна-грамадскіх і базавых біялагічных дысцыплін. Пачынаючы з трэцяга курса, навучанне студэнтаў ажыццяўляецца асобна, згодна адпаведнай кваліфікацыі.

За перыяд навучання студэнты атрымліваюць шырокую прафесійную падрыхтоўку, якая забяспечваецца вывучэннем у вялікім аб'ёме такіх дысцыплін біялагічнага цыкла, як батаніка, заалогія, цыталогія і гісталогія, біяхімія, біяфізіка, радыябіялогія, фізіялогія раслін, мікрабіялогія, вірусалогія, імуналогія, біятэхналогія, генетыка, тэорыя эвалюцыі, экалогія, ксенабіялогія і г.д.

Падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыямі "Эколаг-біёлаг" і "Біёлаг-біятэхнолаг" прадугледжвае, акрамя таго, вывучэнне шэрагу дадатковых сучасных спецыяльных дысцыплін, такіх, як прыкладная экалогія, хімічная экалогія, сацыяльная экалогія, радыяэкалогія, экалагічная біяхімія, біяпашкоджанні, папуляцыйная экалогія і г.д. ("Эколаг-біёлаг"); малекулярная біялогія, малекулярная генетыка, клетачная інжынерыя, генетычная інжынерыя, імунаферментны аналіз, імабілізаваныя клеткі і ферменты, біятэхналогія ачысткі прамысловыхў адходаў, інжынерная энзімалогія, фармакагнозія селекцыя прадуцэнтаў, культываванне клетак і г.д. ("Біёлаг-біятэхнолаг").

Факультэт рыхтуе кадры біёлагаў па спецыялізацыях: батаніка, заалогія, мікрабіялогія, генетыка, фізіялогія чалавека і жывёл, фізіялогія раслін, агульная экалогія, біяхімія, біятэхналогія.

Пры падрыхтоўцы спецыялістаў прадугледжана праходжанне практык: на 1 і 2 курсах — палявая практыка па батаніцы і заалогіі, на 3 — вучэбная практыка па спецыялізацыі на кафедрах, у біяцэнозах, НДІ, вытворчых установах, на 4 і 5 курсах — вытворчая і педагагічная практыка.

Вучэбны працэс і навуковую работу факультэта забяспечваюць восем кафедраў, НДЛ гідраэкалогіі, НДЛ кафедраў, заамузей, гербарый, батанічны сад, вучэбна-даследчая гаспадарка "Шчамысліца", вучэбная лабараторыя методыкі выкладання біялогіі.

Пасля заканчэння факультэта выпускнікі могуць працаваць выкладчыкамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, а таксама на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, фармацэўтычнай, мікрабіялагічнай і харчовай прамысловасці, у запаведніках, батанічных садах, селекцыйных станцыях і г.д.

Выпускнікі, якія паказалі схільнасць да навукова-даследчай работы, высокую эрудыцыю па біялогіі, атрымліваць рэкамендацыю савета факультэта для паступлення ў аспірантуру і магістратуру.

(вуліца Курчатава, 5, тэл. 277-10-06)

Дэкан — дацэнт ЛЫСАК Уладзімір Васільевіч

Філасофска-эканамічны

Адкрыццё факультэта адбылося ў верасні 1989 года. Першапачаткова ён уключаў у сябе тры аддзяленні — філасофіі, эканамічнай тэорыі і сацыялогіі. У апошні час да іх далучыліся яшчэ тры — эканомікі і кіравання вытворчасцю, культуралогіі і псіхалогіі.

Спецыяльная падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца кафедрамі гісторыі філасофіі і логікі; этыкі, эстэтыкі і культуралогіі; сацыялогіі; эканамічных навук; псіхалогіі.

Пачынаючы з трэцяга курса, студэнты праходзяць вучэбную, вытворчую і педагагічную практыку на факультэтах універсітэта, у іншых ВНУ г.Мінска, на прадпрыемствах народнай гаспадаркі, ў органах дзяржаўнага кіравання. Вучэбны працэс ажыццяўляецца кваліфікаванымі выкладчыкамі, сярод якіх 20 дактароў і больш за 70 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Для выкладання запрашаюцца спецыялісты з інстытута Акадэміі навук Беларусі, а таксама з іншых навуковых цэнтраў рэспублікі, блізкага і далёкага замежжа. Пачынаючы з другога курса, студэнты прыцягваюцца да актыўнай творчай дзейнасці, спрабуючы свае сілы ў навукова-даследчай рабоце, удзельнічаючы ў навуковых канферэнцыях, якія праводзяцца як ва універсітэце, так і ў іншых ВНУ.

Асноўная ўвага пры падрыхтоўцы філосафаў надаецца глыбокаму вывучэнню сусветнай і айчыннай філасофіі. Кожнае новае пакаленне філосафаў, спасцігаючы таямніцы быцця, шукае адказ на пытанні паходжання свету і чалавечага грамадства, авалодвае навыкамі дыялектычнага мыслення. Гэтаму садзейнічаюць дысцыпліны прыродазнаўчага і гуманітарнага цыклаў (асновы вышэйшай матэматыкі, фізікі, біялогіі, сацыялогіі, гісторыі, псіхалогіі і г.д.)

Вучоба на эканамічных аддзяленнях узбройвае студэнтаў ведамі сутнасці вытворчых адносін, законаў эканамічнага развіцця. Будучыя эканамісты атрымліваюць добрую матэматычную падрыхтоўку, авалодваюць навукамі канкрэтнага аналізу эканамічных працэсаў, вывучаюць гісторыю народнай гаспаданаркі рэспублікі, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму, маркетынг і іншыя спецыяльныя эканамічныя дысцыпліны.

На аддзяленні сацыялогіі студэнты авалодваюць цэлым комплексам сацыялагічных дысцыплін агульнага і спецыяльнага характару, знаёмяцца з тэорыяй і гісторыяй сацыялагічнай спадчыны, асвойваюць навыкі машыннай апрацоўкі заходніх данных. Вялікая ўвага надаецца вывучэнню дысцыплін матэматычнага цыкла, агульнай і сацыяльнай псіхалогіі. Спецкурсы прысвечаны вывучэнню праблем працы, быту, зносін, кіравання, выхавання, культуры, адукацыі і г.д.

У 1993 годзе на факультэце адкрыта аддзяленне псіхалогіі. Вучэбная праграма аддзялення прадугледжвае падрыхтоўку спецыялістаў у галіне агульнай і сацыяльнай псіхалогіі, акрамя цэлага комплексу сацыяльных дысцыплін студэнты вывучаюць шэраг прадметаў агульнакультурнага, матэматычнага і прыродазнаўчага профілю.

У гэтым годзе на факультэце пачынаецца падрыхтоўка студэнтаў па 2 новых спецыяльнасцях: "менеджмент", "інфармацыя і камунікацыя". Спецыяльнасць "менеджмент" уводзіцца замест спецыяльнасці "эканоміка і кіраванне вытворчасцю", а "інфармацыя і камунікацыя" з'яўляецца новай для нашага факультэта.

Студэнты аддзялення "інфармацыя і камунікацыя" будуць вывучаць вялікі цыкл дысцыплін па тэорыі і практыцы інфармацыі на сучасных камп'ютэрных тэхналогіях і іх прымяненні ў грамадстве. Акрамя таго, яны атрымліваюць добрую падрыхтоўку ў галіне сучасных сродкаў масавай камунікацыі і інфармацыі, а таксама сталыя веды ў шырокім шэрагу сацыяльных і гуманітарных навук, якія традыцыйныя для выпускнікоў нашага факультэта.

(вуліца К.Маркса, 31, тэл. 227-60-25)

Дэкан — прафесар ЗЕЛЯНКОЎ Анатоль Ізотавіч

Прыкладной матэматыкі і інфарматыкі

Дата стварэння: 1 красавіка 1970 года.

Колькасць кафедраў: 11.

Колькасць студэнтаў: больш за тысячу.

Склад выкладчыкаў: 14 прафесараў і дактароў навук, больш за 80 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях: прыкладная матэматыка; інфарматыка; эканамічная кібернетыка; актуарная матэматыка.

Пасля дадатковай педагагічнай падрыхтоўкі і практыкі, выпускнікі факультэта могуць працаваць выкладчыкамі матэматыкі і інфарматыкі.

На першым і другім курсах для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў выкладаюцца агульнаматэматычныя і агульнапраграмісцкія дысцыпліны (матэматычны аналіз, геаметрыя і алгебра, дыферэнцыяльныя ўраўненні, ЭВМ і праграмiраванне, практыкум на ЭВМ і іншыя). Спецыялізацыя студэнтаў факультэта ў межах выбранай спецыяльнасці ажыццяўляецца з трэцяга курса.

Спецыяльнасць "Прыкладная матэматыка" (кваліфікацыя "Матэматык-праграміст") уключае наступныя спецыялізацыі: лікавыя метады, аптымізацыя і аптымальнае кіраванне, матэматычная фізіка, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын і сістэм, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне праблемна арыентаваных сістэм, тэорыя імавернасцяў і матэматычная статыстыка, актуарная матэматыка і статыстыка, матэматычнае забеспячэнне сістэм аўтаматызаванага праектавання і кіравання, даследаванне аперацый і сістэмны аналіз, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне крыптаграфіі і аналізу данных.

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляецца: стварэнне матэматычных мадэлей, алгарытмаў і праграм кіравання аб'ектамі і працэсамі; распрацоўка матэматычнага і праграмнага забеспячэння электроннай вылічальнай тэхнікі.

Спецыяльнасць "Інфарматыка" (кваліфікацыя "Матэматык-сістэмны праграміст") уключае наступныя спецыялізацыі: праграмнае забеспячэнне вылічальных сістэм і сетак (сістэмнае праграмiраванне); праграмнае забеспячэнне сістэм аўтаматызацыі; сістэмы штучнага інтэлекту; архітэктура вылічальных сістэм; арганізацыя, распрацоўка і праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм.

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляецца: сварэнне матэматычных мадэлей і аўтаматызацыя праектавання складаных сістэм; распрацоўка сістэмнага праграмнага забеспячэння сродкаў вылічальнай тэхнікі.

Спецыяльнасць "Эканамічная кібернетыка" (кваліфікацыя "Матэматык-эканаміст") уключае наступныя спецыялізацыі: матэматычнае і праграмнае забеспячэнне камп'ютэрнага аналізу, мадэлявання і прагназіравання ў эканоміцы; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне сістэм апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляецца: матэматычнае мадэляванне і аптымізацыя эканамічных працэсаў і сістэм; эканаметрычны аналіз і прагназіраванне ў эканоміцы і бізнесе; распрацоўка камп'ютэрных сістэм апрацоўкі інфармацыі і кіравання ў эканоміцы і бізнесе.

Спецыяльнасць "Актуарная матэматыка" (кваліфікацыя "Матэматык-фінансіст") уключае спецыялізацыю "Матэматыка страхавання".

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляецца: інвестыцыйны аналіз і кіраванне актывамі; агульнае страхаванне і страхаванне жыцця; пенсійнае забеспячэнне; дэмаграфічная статыстыка.

Пры факультэце дзейнічае спецыяльны факультэт бізнесу і інфармацыйных тэхналогій на якім вядзецца падрыхтоўка і перападрыхтоўка па спецыяльнасцях "Эканамічная кібернетыка" (спецыялізацыі: інфармацыйна-прававое забеспячэнне гаспадарчай дзейнасці, інфармацыйныя тэхналогіі ў бізнесе, інфармацыйныя банкаўскія сістэмы) і "Актуарная матэматыка" (спецыялізацыя: фінансавы менеджмент; матэматыка фінансавага рынку). Акрамя таго, на спецфакультэце студэнты 5-га курса іншых спецыяльнасцяў маюць магчымасць дадаткова вывучыць фінансава-эканамічныя дысцыпліны і атрымаць другі дыплом дзяржаўнага ўзору аб перападрыхтоўцы з прысваенням адпаведнай кваліфікацыі.

Студэнты займаюцца навуковай працай, удзельнічаюць у рашэнні актуальных прыкладных задач і распрацоўцы прыкладнога праграмнага забеспячэння.

(праспект Ф.Скарыны, 4, тэл. 268-70-87)

Дэкан — дацэнт МАНДРЫК Павел Аляксеевіч

Міжнародных адносінаў

Факультэт міжнародных адносінаў створаны 1 кастрычніка 1995 года з мэтай падрыхтоўкі прафесіяналаў высокага класу ў галіне міжнародных зносінаў, здатных годна прадстаўляць інтарэсы нашай краіны на сусветнай арэне.

Ён уключае ў сябе чатыры аддзяленні — міжнародныя зносіны, міжнароднае права, міжнародныя эканамічныя адносіны і менеджмент у галіне міжнароднага турызму.

Навучальны працэс ажыццяўляюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, сярод якіх 7 прафесараў, 23 дацэнты і 30 выкладчыкаў без ступені. Для чытання лекцый прыцягваюцца вядучыя спецыялісты Акадэміі Навук Беларусі, работнікі Міністэрства замежных спраў, знешнеэканамічных і знешнепалітычных ведамстваў, буйныя спецыялісты міжнародных зносінаў краінаў СНД і далёкага замежжа. Пачынаючы з другога курса, студэнты праходзяць навучальную і вытворчую практыку ў дзяржаўных органах і ведамствах, якія займаюцца знешняй палітыкай, на прадпрыемствах і ў фірмах. Навучаючыся на факультэце, студэнты атрымліваюць глыбокія веды ў галіне агульнагуманітарных і агульнанавуковых дысцыплінаў, гісторыі міжнародных зносінаў і знешняй палітыкі, міжнароднага права, міжнародных эканамічных адносінаў, краіназнаўства, авалодваюць дзвюма замежнымі мовамі; набываюць навыкі працы на персанальных камп'ютэрах.

Асноўная ўвага пры падрыхтоўцы спецыялістаў на аддзяленні міжнародных зносінаў надаецца глыбокаму вывучэнню агульнай і айчыннай гісторыі, тэорыі і гісторыі міжнародных зносінаў і знешняй палітыкі вядучых краінаў свету, дзейнасці міжнародных арганізацый, дыпламатычнай і консульскай службе, дыпламатычнаму пратаколу. Пачынаючы з 4-га курса, студэнты спецыялізуюцца па гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі і міжнародных арганізацыях.

На аддзяленні міжнароднага права вывучаюць гісторыю і тэорыю дзяржавы і права, міжнароднае публічнае і прыватнае права, дыпламатычнае і консульскае права, міжнароднае камерцыйнае, мытнае права, параўнаўчае адміністратыўнае, крымінальнае, гаспадарчае, працоўнае права. З 3-га курса студэнты спецыялізуюцца па міжнароднаму прыватнаму і міжнароднаму публічнаму праву.

Будучыя эканамісты-міжнароднікі атрымаюць веды ў галіне макра- і мікраэканамічнага развіцця, будуць мець добрую матэматычную падрыхтоўку, авалодаюць навыкамі канкрэтнага аналізу эканамічных працэсаў, вывучаць гісторыю народнай гаспадаркі, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму, маркетынг, сусветную эканоміку, кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю, міжнародныя валютныя і крэдытныя зносіны.

На аддзяленні міжнароднага турызму студэнты атрымліваюць веды па асновах менеджменту, маркетынгу міжнароднага турызму, арганізацыі і кіраванню турысцкімі прадпрыемствамі, вывучаюць геаграфію міжнароднага турызму, прагназаванне міжнароднага турысцкага рынку, эканоміку міжнародных турысцкіх перавозак, рэгіянальнае планаванне турызму, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму, сусветную эканоміку, кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю, міжнародныя валютныя і крэдытныя адносіны.

Вялікая ўвага на факультэце надаецца самастойнай навукова-даследчай працы студэнтаў. Яны выступаюць на навуковых канферэнцыях, прадстаўляюць свае распрацоўкі на універсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

Маладыя спецыялісты будуць падрыхтаваныя для дыпламатычнай, навукова-даследчай, інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ў галіне міжнародных зносінаў, міжнароднага права і знешнеэканамічнай дзейнасці.

Выпускнікі факультэта змогуць працаваць у дзяржаўных органах кіравання, якія займаюцца знешнеэканамічнай і знешнепалітычнай дзейнасцю, у міжнародных арганізацыях і рэгіянальных аб'яднаннях, у якіх Рэспубліка Беларусь мае пасольскія прадстаўніцтвы, на прадпрыемствах, у знешнегандлёвых, турыстычных і камерцыйных фірмах, банках. Яны могуць займацца навукова-педагагічнай работай у навуковых, навучальных установах.

(вуліца Бабруйская, 9, тэл. 220-65-43)

Дэкан — прафесар ШАРАПА Аляксандр Віктаравіч

Радыёфізікі і электронікі

Дарагі выпускнік!

Калі цябе вабіць сучасная радыёфізіка, электроніка і інфарматыка, калі ты жадаеш асвоіць сучасныя электронныя і інфармацыйныя тэхналогіі, калі імкнешся знайсці сваё месца ў сучаснай эканамічнай сістэме — не сумнявайся: адрас тваёй мары — факультэт радыёфізікі і электронікі.

Факультэт радыёфізікі і электронікі адкрыўся ў 1976 годзе. Зараз гэта буйны навучальны і навуковы цэнтр, у якім атрымліваюць вышэйшую адукацыю каля 700 студэнтаў. На васьмі кафедрах працуюць больш за 90 выкладчыкаў, сярод якіх 1 акадэмік і 2 члена-карэспандэнта АН Беларусі, 15 дактароў навук і прафесараў. Пры кафедрах працуюць навукова-даследчыя лабараторыі і групы, студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі.

Выпускнікам спецыяльнасці "Радыёфізіка" прасвойваецца кваліфікацыя "Радыёфізік", а спецыяльнасці "Фізічная электроніка" — кваліфікацыя "Інжынер-фізік". Навучальны план спецыяльнасцей пабудаваны ў рамках двухузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі наданнем акадэмічных ступеней бакалаўра і магістра.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца для навукова-даследчай, даследна-канструктарскай, вытворчай і арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці ў галіне радыёфізікі і электронікі, іх сучасных дадаткаў, даследавання фізічных працэсаў у электроніцы, стварэння і даследавання радыёфізічных і электронных прыстасаванняў і прыбораў, прымяненне іх у разнастайных галінах навукі і тэхнікі.

З 1995 года факультэт пачаў падрыхтоўку па новай спецыяльнасці — "Камерцыйная дзейнасць на рынку радыёэлектронных сродкаў і інфармацыйных паслуг", выпускнікам якой надаецца кваліфікацыя "Эканаміст-таваразнаўца". Навучальны план спецыяльнасцей пабудаваны па 4-гадовай праграме вышэйшай адукацыі.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца для арганізацыйна-кіраўніцкай і камерцыйна-вытворчай дзейнасці ў галіне радыёэлектронікі і інфарматыкі. Спецыялісты прызначаюцца для работы на прадпрыемствах і фірмах, звязаных з вытворчасцю, раэлізацыяй, абслугоўваннем вырабаў радыёэлектронікі, а таксама ў фірмах, якія займаюцца распрацоўкай камп'ютэрных інфармацыйных сістэм і арганізацыяй інфармацыйнага забеспячэння.

Структуру навучальнага плана гэтай спецыяльнасці складаюць наступныя дысцыпліны:

дысцыпліны, якія раскрываюць прынцыпы работы, архітэктуру, магчымасці і тэндэнцыі развіцця камп'ютэрных сістэм, інфармацыйных сістэм, сродкаў тэлекамунікацыі і г.д.;

тэарэтычныя асновы, прынцыпы работы і пабудовы прамысловай, офіснай і бытавой электронікі;

асновы тэхналогій электронных вытворчасцей, асновы метралогіі, стандартызацыі, сертыфікацыі і кіравання якасцю;

спецыяльныя дасцыпліны, якія забяспечваюць базавую эканамічную падрыхтоўку;

мікра- і макраэканоміка, асновы прадпрымальніцкай дзейнасці, фінансы і крэдыт, бухгалтарскі ўлік, тэорыя падаткаў;

спецыяльныя дысцыпліны, якія забяспечваюць падрыхтоўку па менеджменту і маркетынгу радыёэлектроннага бізнесу: агульная тэорыя менеджменту, эканамічная кібернетыка, асновы маркетынгу, кіраванне ў радыёэлектронных фірмах, маркетынг вырабаў радыёэлектронікі;

дысцыпліны, якія раскрываюць прынцыпы пабудовы, магчымасці і метады выкарыстання існуючых пакетаў прыкладных праграм і інтэграваных сістэм для персанальных ЭВМ у мэтах інфармацыйнага забеспячэння менеджменту, маркетынгу, фінансавых аперацый;

прававыя асновы фінансавай дзейнасці і менеджменту, асновы патэнтазнаўства і аўтарскага права.

Чакаем Вас на факультэце радыёфізікі і электронікі!

(вуліца Курчатава, 5, тэл. 277-19-01)

Дэкан — прафесар МУЛЯРЧЫК Сцяпан Рыгоравіч

Журналістыкі

Ва ўсіх рэдакцыях газет, радыё і тэлебачання, выдавецтвах Рэспублікі Беларусь працуюць выпускнікі факультэта журналістыкі, які быў створаны ў 1944 годзе. За гэты час падрыхтавана каля пяці тысяч спецыялістаў. Факультэт ганарыцца сваімі выпускнікамі, якія сталі вядомымі журналістамі, пісьменнікамі, палітычнымі і грамадскімі дзеячамі. Цяпер у журналісцкай "альма-матэр" вучыцца звыш 700 студэнтаў.

Падрыхтоўка журналістаў вядзецца як на дзённай, так і на завочнай форме навучання на базе сярэдняй адукацыі. Атрымаць журналісцкую прафесію могуць таксама асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю і жадаюць звязаць сваё жыццё са сродкамі масавай інфармацыі.

Паралельна з традыцыйным спецыялізаваным навучаннем студэнтаў для літаратурнай работы ў газеце, часопісе, на радыё і тэлебачанні факультэт рыхтуе сучасныя кадры па профільнаму прызначэнню: журналіст-міжнароднік, фотажурналіст, рэдактар выдавецтва, рэдактар-праграміст камп'ютэрнага дызайну, рэдактар рэкламы, каментатар тэлебачання і радыё, аператар і рэжысёр тэлебачання, літаратурна-мастацкі крытык, палітычны аглядальнік, эканамічны аглядальнік.

У 1996 — 1997 навучальным годзе адкрыта новая спецыяльнасць "Інфармацыя і камунікацыя". Тут вядзецца падрыхтоўка па наступных накірунках: спецыяліст па сувязях з грамадскасцю, спецыяліст па рэкланай камунікацыі, спецыяліст па аўдыёвізуальнай каунікацыі, спецыяліст па міжнароднай камунікацыі.

За 5 гадоў універсітэцкага сталення студэнты набываюць трывалыя тэарэтычныя веды, практычныя навыкі журналісцкай работы, атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па беларускай, рускай і замежнай мовах, гісторыі беларускай, рускай і замежнай журналістыкі і літаратуры, вывучаюць асновы фотарэпартажу, тэхніку афармлення газет, радыё- і тэлеперадач, практычную стылістыку і рэдагаванне, асновы камп'ютэрызацыі сродкаў масавай інфармацыі. Журналіст павінен добра арыентавацца ва ўсіх рэаліях грамадскага жыцця, таму побач са спецыяльнымі студэнты вывучаюць шэраг агульнаадукацыйных дысцыплін: гісторыю, філасофію, палітналогію, актуальныя праблемы эканомікі, эканамічную тэорыю, асновы права, сацыялогію, псіхалогію, гісторыю мастацтваў, этыку, эстэтыку.

Вучэбны працэс на факультэце ажыццяўляюць вопытныя выкладчыкі, сярод 7 дактароў і 21 кандыдат навук.

Першымі практычнымі крокамі студэнтаў у сродках масавай інфармацыі разам з выкладчыкамі кіруюць вопытныя супрацоўнікі газет, радыё і тэлебачання. Курс "Журналісцкае майстэрства", шматлікія дысцыпліны спецыялізацыі і курсы па профілю дазваляюць студэнтам бліжэй пазнаёміцца з творчай лабараторыяй найбольш таленавітых беларускіх журналістаў, пераняць прыёмы і метады іх работы. Летам студэнтаў чакае вытворча-вучэбная практыка ў рэдакцыях часопісаў, газет, на студыях тэлебачання і радыёвяшчання, у рэкламных агенцтвах і прэс-цэнтрах.

Прафесія журналіста традыцыйна асацыіруецца з рамантыкай пошуку: яна самая творчая з масавых і самая масавая з творчых. Дакладна вызначае журналіста карпатлівая праца дзеля ісціны, справядлівасці, гуманізму. Журналістыка — гэта не рамяство, а ў поўным сэнсе — лад жыцця.

(вуліца Маскоўская, 15, тэл. 222-83-40)

Дэкан — дацэнт ВАРАБ'ЁЎ Васіль Пятровіч

Фізічны

Фізічны факультэт з'яўляецца буйнейшым у рэспубліцы навучальным і навуковым цэнтрам, які рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў па важнейшых напрамках сучаснай фізікі, фізічнага матэрыялазнаўства для навукова-даследчых устаноў, прамысловых прадпрыемстваў і народнай адукацыі.

Навучанне на факультэце вядзецца па дзённай форме! Выпускнікі факультэта атрымліваюць кваліфікацыі "Фізік", ці "Інжынер-фізік", ці "Фізік. Выкладчык фізікі і інфарматыкі". Акрамя таго, у час навучання існуе магчымасць атрымаць паралельна кваліфікацыю "Выкладчык фізікі і інфарматыкі". Плануецца падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыяй "Фізік. Арганізатар навуковаёмістых вытворчасцяў", а таксама адкрыццё на факультэце безадрыўнай ад вытворчасці формы навучання з магчымасцю атрымання кваліфікацыі пасля выканання навучальнага плана незалежна ад тэрміну навучання, але не даўжэй, чым за 8 гадоў.

Пасля заканчэння 1-га курса студэнты паводле свайго жадання размяркоўваюцца на педагагічны і навукова-інжынерны напрамкі, а пасля 2-га — па спецыялізацыях.

Падрыхтоўка спецыялістаў-фізікаў на факультэце ажыццяўляецца па розных галінах фізічнай навукі: па фізіцы паўправаднікоў і паўправадніковых матэрыялаў, мікраэлектроніцы і сучаснай мікраэлектроннай тэхналогіі, квантавай і оптаэлектроніцы, класічнай і нелінейнай оптыцы, лазерных сістэмах і тэхналогіях, фізічнай оптыцы, ахоўных і плазменных пакрыццях і плёнках, фізіцы цвёрдага цела і матэрыялазнаўству, ядзернай фізіцы і фізіцы ядзерных рэактараў, электроннаму прыборабудаванню і схематэхніцы, біяфізіцы і біятэхналогіі, цеплафізіцы і нетрадыцыйных крыніцах энергіі і энергазабеспячэння, атамнай фізіцы і фізічных метадах пераўтварэння інфармацыі, фізіцы плазмы і плазменнай апрацоўкі матэрыялаў, фізічнай метралогіі і метадах дыягностыкі, функцыянальных малекулярных і інтэлектуальных матэрыялах, методыцы выкладання фізікі, мадэліраванню фізічных працэсаў, тэарэтычнай фізіцы і праблемах сучаснай фізікі, праграміраванню і інфармацыйнаму забеспячэнню вылічальных сістэм, вучэбнаму фізічнаму эксперыменту.

Акрамя фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы, студэнты факультэта атрымліваюць неабходныя веды па педагогіцы і псіхалогіі, вывучаюць методыку выкладання фізікі і інфарматыкі, эканоміку і асновы арганізацыі вытворчасці, маюць магчымасць атрымаць дадатковую падрыхтоўку па замежнай мове (пасведчанне "Перакладчык-рэферэнт навукова-тэхнічнай літаратуры"). Асаблівая ўвага на факультэце звяртаецца на сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі і інфарматыку.

Шмат увагі на факультэце ўдзяляецца развіццю здольнасцей будучых спецыялістаў. Студэнты факультэта актыўна займаюцца навукова-даследчай работай. На факультэце функцыяніруе болей дзесяці гурткоў па розных фізічных напрамках, студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Каля дзвюх дзесяткаў студэнтаў-фізікаў кожны год атрымліваюць гранты Фонду Сораса і іншых грамадскіх аб'яднанняў.

Студэнты факультэта маюць магчымасць працягваць навучанне ў ВНУ ЗША, ФРГ і іншых заходніх краін. Выпускнікі факультэта могуць працаваць у навукова-даследчых інстытутах, канструктарскіх бюро, у ВНУ, тэхнікумах, ПТВ і школах краіны, на заводах, фабрыках і іншых установах і прадпрыемствах.

Лепшыя студэнты могуць пасля заканчэння навучання працаваць ці працягваць навучанне ў аспірантуры не толькі Белдзяржуніверсітэта і Акадэміі навук Беларусі, але і ў іншых крашнах блізкага і далёкага замежжа.

Узровень адукацыі, атрыманы на факультэце, дазваляе выпускнікам лёгка адаптавацца не толькі да працы па фізіка-тэхнічнаму профілю, але і ў іншых галінах (арганізацыйнай, камерцыйнай, банкаўскай, выдавецкай і інш.).

(вуліца Бабруйская, 5, тэл. 220-62-51)
Дэкан — прафесар КЛІШЧАНКА Анатоль Пятровіч

Філалагічны

Усіх прыхільнікаў роднага слова, усіх, каго вабіць прыгожае пісьменства, Беларускі дзяржаўны універсітэт запрашае паспаборнічаць на ўступных конкурсных экзаменах, пераможцаў якіх чакае права быць студэнтам філалагічнага факультэта. Тут на працягу першых чатырох-пяці гадоў навучання ў выніку паспяховых пераадольванняў запланаваных залікаў і іспытаў вы атрымаеце вышэйшую адукацыю і адначасова можаце прайсці навучанне для набыцця акадэмічнай ступені бакалаўра, што ўключае ў сябе спецыяльныя дадатковыя курсы гуманітарнай і фундаментальнай навуковай падрыхтоўкі.

Не сумнявайцеся ў сваіх філалагічных здольнасцях, бо калі вашу прагу да ведаў не спатоліць жаданы атэстат аб вышэйшай адукацыі або дыплом бакалаўра, вы маеце магчымасць на працягу яшчэ аднаго-двух гадоў удасканальвацца ў сваіх прафесійных памкненнях па індывідуальных вучэбных планах і дамагчыся акадэмічнай ступені магістра. Калі і гэта станецца недастатковым — перад вамі шлях у вялікую навуку праз аспірантуру на ільготных умовах.

На сённяшні момант на факультэце працуюць 17 прафесараў і 82 дацэнты, якія рыхтуюць высокакваліфікаваных спецыялістаў у наступных накірунках: беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, польская мова і літаратура, сербская і харвацкая мовы і літаратуры, англійская мова і літаратура, нямецкая мова і літаратура, французская мова і літаратура, італьянская мова і літаратура. Доўжыцца падрыхтоўка спецыялістаў у галіне класічнай філалогіі, для чаго на факультэце створана спецыяльная кафедра. Паралельна з пералічанымі прафесіямі вы можаце задавальняць свае патрэбы па самых разнастайных тэматыках замежнай літаратуры, а таксама ў галінах тэарэтычнай, супастаўляльнай і камп'ютэрнай лінгвістыкі.

(вуліца К.Маркса, 31, тэл. 222-34-21)
Дэкан — прафесар МУРЫНА Ларыса Аляксандраўна

Хімічны

Хімічны факультэт заснаваны ў 1931 годзе і сёння з'яўляецца адзіным цэнтрам у рэспубліцы па падрыхтоўцы хімікаў з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй. За гэтыя гады падрыхтавана больш 5 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў, якія ўнеслі і ўносяць значны ўклад у развіццё хімічных навук і хімічнай прамысловасці ў рэспубліцы, паспяхова працуюць у агульнаадукацыйных школах, тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах.

На хімічным факультэце будзе ажыццяўляцца прыём 100 чалавек: на агульнае аддзяленне 60 чалавек, 15 на спецыяльнасць "хімік-эколаг" і 25 чалавек на спецыяльнасць "хімія лекавых злучэнняў" (асобны конкурс). Студэнты агульнага аддзялення (60 чалавек) змогуць атрымаць кваліфікацыю "Хімік" альбо "Хімік. Выкладчык хіміі" ў залежнасці ад іх выбару пасля I курса.

На факультэце дзейнічаюць шэсць кафедраў: неарганічнай, аналітычнай, арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў, фізічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, агульнай хіміі і метадыкі выкладання хіміі. На факультэце працуюць 2 акадэмікі АН РБ і больш за 10 дактароў, амаль 90% усіх выкладчыкаў факультэта маюць навуковыя ступені. Пры кафедрах факультэта дзейнічае шэраг навукова-даследчых лабараторый, супрацоўнікі якіх прыцягваюцца да вядзення вучэбнага працэсу.

За гэцігадовы перыяд навучання на дзённым аддзяленні студэнты атрымліваюць шырокую агульнафізічную падрыхтоўку, якая забяспечваецца вывучэннем у шырокім аб'ёме такіх дысцыплін хімічнага цыкла, як аналітычная, арганічная, неарганічная, калоідная, квантавая, фізічная хімія, хімія высокамалекулярных злучэнняў, крышталяхімія, будова рэчыва, хімічная тэхналогія і мадэліраванне тэхналагічных працэсаў і іншыя. Універсітэцкая адукацыя забяспечвае і дастатковую глыбокую агульнагуманітарную падрыхтоўку спецыялістаў-хімікаў, якая ажыццяўляецца дзякуючы вывучэнню дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла.

Падрыхтоўка па спецыялізацыі пачынаецца з чацвёртага курса.

Студэнты, якія рыхтуюцца да педагагічнай дзейнасці, вывучаюць шэраг дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла і праходзяць педагагічную практыку. На стадыі спецыялізацыі студэнты праходзяць паглыбленную спецыяльную падрыхтоўку па кафедрах, вывучаюць цыкл спецыяльных дысцыплін, які забяспечвае атрыманне сучасных тэарэтычных ведаў у пэўнай галіне хіміі. Студэнты праходзяць вытворчую практыку на базе прадпрыемстваў і НДІ рэспублікі. Лепшыя студэнты атрымліваюць рэкамендацыі для паступлення ў аспірантуру. Выпускнікі факультэта працуюць у навукова-даследчых установах або на прадпрыемствах электроннай, радыётэхнічнай і хімічнай прамысловасці, школах і ВНУ рэспублікі.

Пра тое, як праходзяць прыёмныя экзамены, пра патрабаванні, якія ставяцца да абітурыентаў, можна даведацца ў перыядычным рэспубліканскім выданні — часопісе для старшакласнікаў і абітурыентаў "Рэпетытар".

З 1995 года факультэт вядзе падрыхтоўку спецыялістаў для фармацэўтычнай прамысловасці рэспублікі.

(вуліца Ленінградская, 14, тэл. 226-49-98)
Дэкан — прафесар БРАНІЦКІ Генадзь Аляксеевіч

ПЛАН ПРЫЁМУ Ў БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ У 1997 ГОДЗЕ, КОНКУРС І ПРАХАДНЫ БАЛ У 1996 ГОДЗЕ

Назва спецыяльнасці	План прыёму ў 1997 годзе		Дзённае навучанне (1996 год)	
	Дзённае навучанне	Завочнае навучанне	Конкурс	Прахадны бал
МАТЭМАТЫКА	145	25	1.64	14
МЕХАНІКА	25	—	2.28	13
ПРЫКЛАДНАЯ МАТЭМАТЫКА	70	—	2.74	15
ІНФАРМАТЫКА	65	—	2.58	14
ЭКАНАМІЧНАЯ КІБЕРНЕТЫКА *	20	—	2.20	—
АКТУАРНАЯ МАТЭМАТЫКА **	20	—	3.25	—
ФІЗІКА ***	140	—	1.50	—
РАДЫЁФІЗІКА ***	60	—	1.26	—
ФІЗІЧНАЯ ЭЛЕКТРОНІКА	50	—	2.02	12
КАМЕРЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ	20	—	2.55	12
ХІМІЯ	60	—	1.89	12
ХІМІЯ ЛЕКАВЫХ ЗЛУЧЭННЯЎ	25	—	1.88	10
ЭКАЛОГІЯ-ХІМ.	15	—	2.00	10
БІЯЛОГІЯ	65	50	2.53	13
БІЯТЭХНАЛОГІЯ	20	—	2.30	13
ЭКАЛОГІЯ-БІЯЛ.	15	—	2.80	12
ГЕАГРАФІЯ	70	50	2.49	13
ЭКАЛОГІЯ-ГЕАГР.	20	—	2.80	13
ГЕАЛОГІЯ І РАЗВЕДКА КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ	20	—	2.05	9
МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ	15	20	2.73	13
ГІСТОРЫЯ	75	50	2.76	13
ГІСТОРЫКА-АРХІВАЗНАЎСТВА	15	20	2.73	13
БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА	90	50	2.14	13
РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА	50	25	2.64	13
СЛАВЯНСКІЯ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ	30	—	2.30	11
ЖУРНАЛІСТЫКА	50	25	4.94	18
ІНФАРМАЦЫЯ І КАМУНІКАЦЫЯ (ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ)	15	—	3.07	13
ФІЛАСОФІЯ	20	15	4.07	12
ПСІХАЛОГІЯ	20	—	5.93	13
САЦЫЯЛОГІЯ	20	15	4.00	13
ЭКАНАМІЧНАЯ ТЭОРЫЯ	15	15	4.40	13
ПАЛІТАЛОГІЯ	20	—	3.40	12
ПРАВАЗНАЎСТВА	150	50	5.31	13
МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ	25	—	3.76	17
СУСВЕТНАЯ ЭКАНОМІКА І МІЖНАРОДНЫЯ ЭКАНАМІЧНЫЯ АДНОСІНЫ	25	—	5.27	14
МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА	25	—	4.48	14
Новыя спецыяльнасці				
АНГЛІЙСКАЯ МОВА	15	—		
ФРАНЦУЗСКАЯ МОВА	15	—		
НЯМЕЦКАЯ МОВА	15	—		
ІТАЛЬЯНСКАЯ МОВА	15	—		
ІНФАРМАЦЫЯ І КАМУНІКАЦЫЯ (ФІЛАСОФСКА-ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ)	15	—		
МЕНЕДЖМЕНТ(ФІЛАСОФСКА-ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ)	15	—		
МЕНЕДЖМЕНТ У СФЕРЫ МІЖНАРОДНАГА ТУРЫЗМУ	15	—		

* — залічаныя толькі пераможцы алімпіядаў
** — залічаныя толькі пераможцы алімпіядаў і медалісты
*** — замест экзаменаў праводзілася субяседаванне

Юрыдычны

Юрыдычны факультэт — асноўны цэнтр Рэспублікі Беларусь па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па правазнаўству. На яго дзённым і завочным аддзяленнях вучыцца больш за 3,1 тысячы студэнтаў.

За час вучобы на факультэце студэнты вывучаюць тэорыю права, канстытуцыйнае, адміністрацыйнае, фінансавае, працоўнае, грамадзянскае, крымінальнае, міжнароднае права, крымінальны і грамадзянскі працэс, крыміналістыку і іншыя дысцыпліны.

Юрыдычны факультэт рыхтуе спецыялістаў па правазнаўству па шасці спецыяльнасцях: дзяржаўна-прававой, гаспадарча-прававой, судова-пракурорска-следчай, міжнароднаму праву і прававому забеспячэнню знешнеэканамічнай дзейнасці, падатковаму і банкаўскаму праву, адвакатуры і натарыяту.

Дзяржаўна-прававая спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў Саветаў дэпутатаў, іх выканкамах, апаратах міністэрстваў, ведамстваў і іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання.

Выпускнікі гаспадарча-прававой спецыялізацыі накіроўваюцца ў міністэрствы, ведамствы, на прадпрыемствы, ва ўстановы і арганізацыі для работы юрысконсультамі.

На судова-пракурорска-следчай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракуроў і следчых.

Спецыялізацыя "Міжнароднае права і прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці" дасць магчымасць яе выпускнікам працаваць у апараце Міністэрства замежных спраў, дыпламатычных місіях краіны за мяжой, сумесных прадпрыемствах, іншых арганізацыях і ўстановах.

Пасля спецыялізацыі па падатковаму і банкаўскаму праву выпускнікі факультэта могуць выкарыстаць свае веды ў органах падатковай службы і ўстановах банкаў.

Спецыялізацыя па адвакатуры і натарыяту накіравана на падрыхтоўку спецыялістаў па прававому абслугоўванню грамадзян — адвакатаў і натарыусаў.

З 1994 года на факультэце дзейнічае таксама аддзяленне паліталогіі. Яго выпускнікі будуць атрымліваць кваліфікацыю "паліталаг-юрыст" і змогуць працаваць у органах дзяржаўнай улады і кіравання, грамадскіх аб'яднаннях, палітычных партыях у якасці кансультантаў, рэферэнтаў і г.д.

Вучэбны працэс забяспечваюць 9 кафедраў: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, крымінальнага права, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, экалагічнага і аграрнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, крыміналістыкі, паліталогіі. На ўсіх кафедрах працуюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, сярод якіх 15 дактароў і 67 кандыдатаў навук.

На факультэце ёсць бібліятэка, лабараторыя заканадаўства, крыміналістычная лабараторыя, лабараторыя інфарматыкі.

Студэнты факультэта, якія добра праявілі сябе ў навукова-даследчай рабоце, рэкамендуюцца для паступлення ў аспірантуру.

Юрыдычны факультэт мае добрыя ўмовы для раскрыцця здольнасцей і талентаў студэнтаў. На базе музея правазнаўства факультэта працуе гісторыка-культурны цэнтр.

(вуліца Маскоўская, 17, тэл. 222-83-18)
Дэкан — дацэнт ГАДУНОЎ Валерый Мікалаевіч

Геаграфічны

Геаграфічны факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі студэнтаў па фізічнай, эканамічнай геаграфіі, геаморфалогіі, краязнаўству і методыцы арганізацыі экскурсійнай справы, рацыянальнаму прыродакарыстанню і ахове прыроды. З 1994 года на факультэце пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях — "Экалогія" і "Геалогія".

У саставе факультэта восем кафедраў: агульнага землязнаўства; фізічнай геаграфіі і аховы прыроды; фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі; геадэзіі і картаграфіі; глебазнаўства і геалогіі; дынамічнай геалогіі; эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці; эканамічнай геаграфіі замежных краін. Дзейнічаюць пяць навукова-даследчых лабараторый: экалогіі ландшафтаў, возеразнаўства, маніторынга водных рэсурсаў, геаэкалагічных праблем, комплекснага картаграфіравання і геаэкалогіі, а таксама музей землязнаўства, вучэбна-геаграфічная станцыя "Заходняя Бярэзіна".

На факультэце працуюць 15 дактароў (прафесараў) і звыш 40 кандыдатаў навук. Наш факультэт мае слаўныя традыцыі, ён ганарыцца сваімі выпускнікамі, сярод якіх пяць акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН РБ, звыш 30 дактароў навук, прафесараў, 16 лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій СССР, БССР. Студэнты факультэта атрымліваюць прыродазнаўча-навуковую і спецыяльную падрыхтоўку.

Значнае месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў належыць вучэбна-вытворчай практыцы. Студэнты 1 і 2 курсаў на геаграфічнай станцыі "Заходняя Бярэзіна" праходзяць вучэбную практыку па тапаграфіі, геалогіі, гідралогіі, геаморфалогіі, глебазнаўству, метэаралогіі, біягеаграфіі, ландшафтазнаўству і эканамічнай геаграфіі. Комплексная геаграфічная практыка студэнтаў другога курса праводзіцца за межамі краіны. Старшакурснікі праходзяць вытворчую практыку ў навукова-даследчых інстытутах Акадэміі навук Беларусі, навукова-даследчых лабараторыях геаграфічнага факультэта, праектных, планавых і гаспадарчых арганізацыях, уключаюцца ў склад экспедыцый, якія праводзяць работу ў Беларусі і за яе межамі. Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Працуюць чатыры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі і шэраг навукова-даследчых гурткоў.

Факультэт рыхтуе кадры географаў па спецыялізацыях: рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды, методыка арганізацыі турысцка-экскурсійнай справы; фізічная геаграфія; сацыяльна-эканамічная геаграфія; геаграфія глебаў, зямельныя рэсурсы, меліярацыя; картаграфія; гідралогія сушы; рэгіянальная сацыяльна-эканамічная геаграфія; метэаралогія і кліматалогія; дэмаграфія. Выпускнікі факультэта працуюць у агульнаадукацыйных школах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, інстытутах Акадэміі навук Беларусі, праектных арганізацыях, на картаграфічных прадпрыемствах, у гідраметэаслужбе, бюро падарожжаў і экскурсій і турбазах. Лепшыя студэнты атрымліваюць рэкамендацыю для паступлення ў аспірантуру.

(вуліца Ленінградская, 16, тэл. 226-55-53)
Дэкан — прафесар ЖМОЙДЗЯК Расціслаў Афанасьевіч

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

Газета падпісана ў друк у 12.00.

24 КРАСАВІКА
Зак. 1791
Т. 2000 экз.

Кошт свабодны

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.

В.а. рэдактара Т.М. КАЗАК

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР